# 8 САКАВІКА — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЗНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1195) ● 2 сакавіка 1978 г. Цана 2 кап.


**Хутка універсітэцкі калектыў разам з усім савецкім народам адзначыць цудоўнае вясновае свята — Міжнародны жаночы дзень.**

**Шмат шчырых віншаванняў, падарункаў, кветак у знак павагі і любві атрымліваюць у гэтыя дні нашы добрасумленныя працаўніцы, пяшчотныя маці, цудоўныя сяброўкі — выкладчыцы, супрацоўніцы, аспіранткі і студэнткі.**

**Са святам вас, дарагія жанчыны!**

**Жадаем высокага творчага гарэння, шчасця і радасці ў сям'і, плённай працы ўгонар нашай Радзімы!**



Фота В. ДРАЧОВА.

**1 САКАВІКА Ў СТАЛІЦЫ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ ГОРАДЗЕ-ГЕРОІ МІНСКУ ПАЧАЎ РАБОТУ XXVI З'ЕЗД ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ.**

**ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ З'ЕЗДА!**

## Весткі з факультэтаў

### ГЕАФАК

З 20 лютага па ініцыятыве камітэта камсамола і прафбюро на факультэце праводзіцца дэкада выдатнай паспяховасці і стопрацэнтнай наведваемасці. Камітэт камсамола адзначае колькасць адсутнічаючых на занятках, сочыць за паспяховасцю акадэмічных груп і кожны тыдзень падводзіць вынікі.

* * *

Шмат цікавага ўбачылі студэнты геафака, якія на зімовых канікулах сталі ўдзельнікамі экскурсіі па гарадах саюзных рэспублік. Іх маршруты — Мінск — Алма-Ата — Пржэвальск — Фрунзе — Бухара — Самарканд — Краснаводск — Баку. Цяпер яны арганізуюць сустрэчы, дзеляцца сваімі ўражаннямі.

### МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

З 17 па 28 лютага на факультэце праходзіла грамадска - палітычная атэстацыя. Яе задача — зрабіць больш дзейснай работу камсамольскай арганізацыі, павысіць актыўнасць і ініцыятыву камсамольцаў. У 2-й групе І курса (камсорг Тамара Давыдзік) грамадска - палітычная атэстацыя прайшла на высокім узроўні.

Кожны камсамолец усведамляе сваю задачу: рабіць усё магчымае, каб група была адной з лепшых на факультэце.

### ЖУРФАК

22 лютага адбылася ўрачыстая сустрэча студэнтаў факультэта журналістыкі з выкладчыкамі факультэта — удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. На сустрэчу былі запрошаны госці: выпускнік факультэта журналістыкі, палкоўнік, намеснік рэдактара акруговай газеты «Во славу Родины» Мікалай Іванавіч Касарэнка і падпалкоўнік Іван Васільевіч Цітоў.

З вялікай увагай слухалі студэнты выступленне дэкана факультэта Р. В. Булацкага, доктара гістарычных навук, прафесара Д. П. Жмуроўскага. У адказ ад імя студэнтаў слова ўзяў сакратар камсамольскай арганізацыі, студэнт ІІ курса А. Саламаха.

Памяць аб тых, хто аддаў жыццё за наша светлае сёння, прысутныя ўшанавалі мінутай маўчання. У заключэнне ветэранам былі ўручаны памятныя падарункі.

Г. МАЛАХОЎСКАЯ.

## ПА БДУ
## Інфармацыя

### ДЭЛЕГАТЫ АД БДУ

**1 сакавіка адкрыўся XXVI з'езд камсамолі Беларусі. Шматлікую армію камсамольцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна на ім прадстаўляюць сакратар камітэта камсамола БДУ Анатоль Тозік і студэнтка ІІ курса гістарычнага факультэта Наталля Сінічэнка.**

### РЭСПУБЛІКАНСКІ СЕМІНАР

Рэспубліканскі навукова-метадычны семінар «Удасканаленне сістэмы навукова-тэхнічнай інфармацыі ў ВНУ рэспублікі» быў праведзен у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна з 27 па 28 лютага.

Уступнае слова сказаў рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі. З дакладамі выступілі: намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прафесар І. І. Леановіч, загадчык АНТІ НДІ праблем вышэйшай школы Э. Н. Замураеў, загадчык АНТІ БПІ С. Е. Зіневіч, старшы інжынер АНТІ МРТІ Т. І. Партугалава, старшы навуковы супрацоўнік СНТІ БДУ В. П. Емяльянаў, старшы інжынер Гомельскага Дзяржуніверсітэта І. І. Кобыш і іншыя.

У ходзе семінара працавала выстаўка інфармацыйных і метадычных выданняў. Для ўдзельнікаў семінара была арганізавана экскурсія ў БелНДІНТІ Дзяржплана БССР па навукова-тэхнічнай інфармацыі.

* * *

Аддзяленне савецка-балгарскай дружбы БДУ падрыхтавала вялікую фота- і кніжную выстаўку, прысвечаную 100-годдзю з дня вызвалення Балгарыі ад асманскага іга.

На факультэтах адбыліся лекцыі і гутаркі, прысвечаныя гэтай даце.

### УСЕ — НА СУБОТНІК!

Натхнёныя Пісьмом ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, савецкія людзі поўныя рашучасці паспяхова выканаць заданні трэцяга года пяцігодкі. Шырокае распаўсюджанне атрымаў пачын перадавых прадпрыемстваў Масквы — правесці 22 красавіка камуністычны суботнік, прысвечаны 108-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Студэнты, аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі БДУ падтрымліваюць патрыятычную ініцыятыву — азнаменаваць суботнік ударнай працай.

## 50-гадовы юбілей

**...Зала ўпрыгожана кветкамі. Над сцэнай вісіць эмблема — сімвал мастацкай самадзейнасці — ліра. І вялізная лічба — 50.**

**50 год мастацкай самадзейнасці БДУ. Гэтай даце быў прысвечан урачысты вечар, які прайшоў у Палацы культуры тэкстыльшчыкаў.**

**Вечар адкрыла член парткома С. А. Лысенка. З дакладам аб развіцці і сучасным стане мастацкіх калектываў універсітэта выступіў прарэктар БДУ А. Я. Малышаў. З цікавасцю слухалі прысутныя выступленне намесніка дырэктара Дома мастацкай самадзейнасці І. Барысавай. Яна абвясціла аб прысваенні студэнцкаму тэатру БДУ звання «народны». Гэта паведамленне было сустрэта бурнымі апладысментамі.**

**На вечары выступіў ветэран мастацкай самадзейнасці універсітэта Кузьма Львовіч Кулакоў. Былы артыст рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, ён пачынаў свой творчы шлях у 20-я гады іменна на сцэне нашай установы.**

**Пад апладысменты студэнтаў і выкладчыкаў кіраўнікам мастацкіх калектываў БДУ уручаюцца Ганаровыя граматы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР і сувеніры. Многія ўдзельнікі калектываў — лепшыя з лепшых — былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ, АК ЛКСМБ, аблсаўпрофа.**

**...Музыка, жарты, усхваляваныя словы. З юбілеем вітаюць прадстаўнікі розных ВНУ краіны: ленінградскіх тэхналагічнага і электратэхнічнага інстытутаў, Петразаводскага і Львоўскага універсітэтаў. Да юбіляраў прыехаў хор Ягелонскага універсітэта (г. Кракаў), яго прывітанне заслухоўваецца з вялікай ўвагай.**

**Ад імя мінскіх ВНУ выступілі студэнты МДПІ імя М. Горкага і МРТІ. Прадстаўнікі філфака універсітэта зрабілі прывітанне на стараславянскай мове. Зачытваюцца ўрачыстыя тэлеграмы з Кіева і Ленінграда.**

**Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт.**

**4 калектывы-юбіляры — народны ансамбль танца «Крыжачок», народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла і народны студэнцкі тэатр — паказалі сваё майстэрства гледачам.**

**У канцэрце прынялі ўдзел члены студыі мастацкага слова БДУ і вакальны ансамбль выкладчыкаў філфака «Натхненне».**

**Н. КУЗНЯЦОВА,**
**мастацкі кіраўнік клуба БДУ.**

●

**НА ЗДЫМКУ: выступае прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце прыродазнаўчых факультэтаў А. Я. МАЛЫШАЎ.**

**Фота А. БАСАВА.**



